# НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

## ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ, ВУЧОНЫ, ПЕДАГОГ



*Доктару гістарычных навук, прафесару кафедры паліталогіі і права Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка **Васілю Васільевічу ШЫНКАРОВУ** споўнілася 70 гадоў. Нягледзячы на няпросты лёс, шматлікія выпрабаванні, якія выпалі на яго долю, жыццёвы шлях Васіля Васільевіча быў надзвычай цікавым і насычаным рознымі падзеямі, звязанымі з пасляваеннай гісторыяй Беларусі, плённай працай на карысць Радзімы.*

*В.В. Шынкароў нарадзіўся 15 студзеня 1939 г. ў вёсцы Заполле Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Яго дзяцінства прыпала якраз на гады ваеннага ліхалецця і аднаўлення разбуранай вайной гаспадаркі. У сваім жыцці Васіль Васільевіч заўсёды прытрымліваўся правіла, якое сфармуляваў вядомы нямецкі паэт І. Гётэ: «Хто жадае многага дасягнуць, павінен ставіць высокія патрабаванні». Такія чалавечыя якасці В.В. Шынкарова, як высокая патрабавальнасць да сябе, працавітасць, мэтанакіраванасць, сціпласць, добразычлівасць у адносінах да людзей, дазволілі яму дасягнуць значных прафесійных вяршынь на ўсіх займаемых пасадах. Пасля заканчэння ў 1962 г. філапагічнага факультэта Магілёўскага педагагічнага інстытута ён працаваў дырэктарам школы, на кіруючай камсамольскай і партыйнай рабоце, прарэктарам па вучэбнай і навуковай рабоце, першым прарэктарам Мінскай вышэйшай партыйнай школы, у апаратах Урада, Парламента, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 1986 г. прымаў удзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.*

*Нягледзячы на вялікую занятасць, Васіль Васільевіч знаходзіў час для навуковай працы: абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі па гістарычных навуках. З 2002 па 2006 г. працаваў загадчыкам кафедры паліталогіі і права БДПУ, зараз з'яўляецца яе прафесарам. В.В. Шынкароў актыўна займаецца педагагічнай, навукова-даследчыцкай і грамадскай дзейнасцю. Ён стаяў каля вытокаў стварэння першых падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па курсе «Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы». Усяго ім надрукавана больш за 160 навуковых прац, у тым ліку 5 манаграфій, 9 брашур, шэраг артыкулаў і г. д. Ён узначальвае на кафедры секцыю асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы. В.В. Шынкароў з'яўляецца адным з аўтараў падрыхтаванай па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь канцэпцыі рэфармавання сістэмы мясцовага самакіравання ў краіне. Яго манаграфія «Местное самоуправление: проблемы реформирования» выклікала вялікую цікавасць у кіраўнікоў і супрацоўнікаў мясцовых органаў улады.*

*Васіль Васільевіч займаецца выкладчыцкай і навуковай дзейнасцю, актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці універсітэта: рэгулярна выступае перад студэнтамі і супрацоўнікамі БДПУ на адзіных днях інфармавання, прымае ўдзел у «круглых сталах» па найбольш актуальных праблемах грамадскага развіцця ў студэнцкіх інтэрнатах і г. д. Акрамя таго, ён яшчэ і таленавіты літаратар. Яго творы друкаваліся ў часопісе «Полымя», а ў 2008 г. (напярэдадні юбілею) выйшла аўтабіяграфічная кніга «Імгненні праз жыццё».*

*Васіль Васільевіч уваходзіць у састаў рэдкалегіі штоквартальнага навукова-метадычнага часопіса «Весці БДПУ». Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. Ён з'яўляецца членам двух саветаў па абароне дысертацый: БДУ і Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.*

*За плённую і добрасумленную працу В.В. Шынкароў узнагароджанны шматлікімі граматамі: Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, граматамі Міністэрства сельскай гаспадаркі СССР, Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС, Мінскай вышэйшай партыйнай школы, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка; медалямі і знакам «Удзельнік ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АС».*

*За свае чалавечыя якасці, шматгранную творчую дзейнасць В.В. Шынкароў карыстаецца заслужанай павагай у калег па кафедры, студэнтаў і супрацоўнікаў БДПУ.*

*Супрацоўнікі кафедры паліталогіі і права БДПУ віншуюць Вас, Васіль Васільевіч, з 70-гадовым юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, поспехаў у навуковай, літаратурнай і выкладчыцкай працы.*

*Доктар гістарычных навук **Г.У. Карзенка***